CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

KOD

PESEL

***Miejsce na naklejkę.***
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

## ARKUSZ POKAZOWY

TERMIN: **4 marca 2022 r.**
CZAS PRACY: **210 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **35**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 15 stron.
   Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
5. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
8. Możesz korzystać ze słowników językowych.

MMBB-R0-**100**-2203

Układ graficzny
© CKE 2022

**Выберы адну з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.**

- Твая праца павінна складацца не менш чым з **350 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.

**Тэма 1. (0–35)**

**Пра што людзі гавораць з Богам? Зрабі параўнаўчую інтэрпрэтацыю прыведзеных ніжэй вершаў Рыгора Барадуліна і Янкі Купалы.**

Рыгор Барадулін
***Божа, паспагадай усім***

Божа, паспагадай усім, –
І магутнаму, і слабому,
І відушчаму, і сляпому,
Каб у згодзе жылося ім.

Божа, паспагадай усім, –
Каб вайной не йшоў
Брат на брата,
Каб ржавела сякера ў ката,
Каб вячэраю пахнуў дым.

Божа, паспагадай усім, –
Каб цяплелі пагляды людскія,
Каб у старца не кралі кія,
Нічыіх не кралі радзім.

Да любові, да чысціні,
Да святла, да святога ўлоння,
Усявышні, і заўтра і сёння
Заблуканыя душы вярні!

Р. Барадулін, *Божа, паспагадай усім*, knihi.com

Янка Купала
***Мая малітва***

Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.

Я буду маліцца да яснага сонейка,
Няшчасных зімой саграваць сірацін,
Прыветна па збожных гуляючы гонейках,
Часцей заглядаці да цёмных хацін.

Я буду маліцца да хмараў з грымотамі,
Што дзіка над намі гуляюць не раз,
Каб жаль над гаротнымі мелі бяднотамі,
Градоў, перуноў не ссылалі падчас.

Я буду маліцца да зорак і жаліцца,
Што гасяць сябе надта часта яны,
Бо чуў, як якая з неба з іх зваліцца,
З жыцця хтось сыходзе на вечныя сны.

Я буду маліцца да нівы ўсёй сілаю,
Каб лепшаю ўродай плаціла за труд,
Збагаціла сельскую хату пахілую,
Надзеі збытымі убачыў наш люд.

Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Не вылі над роднай зямлёй, нада мной.

Янка Купала, *Мая малітва*, knihi.com

**Тэма 2. (0–35)**
**У чым заключаецца народнае карэнне “беларускага літаратурнага саду”? Паразважай над пытаннем, абапіраючыся на прыведзены артыкул Паўла Абрамовіча і два выбраныя творы беларускай літаратуры.**

Паводле Паўла Абрамовіча
***З якой глебы расце наш літаратурны сад?***

Беларуская літаратура ствaралася на падставе вусна-паэтычнай спадчыны, калькавала ўсе яе ідэйна-эстэтычныя сэнсы і зместы, усю “праўду і крыўду” падзяляла як сваю. Працяглы час яна выдатна маскіравалася пад народныя казанні і песні, не жадаючы сабе нічога большага.

Калі карыстацца тэрміналогіяй амерыканскага даследчыка Р. Браўна, які падзяляў “высокую” і “масавую” літаратуру па прынцыпе “вынаходлівасці” (invention) і “прадказальнасці” (convention), дык можна сцвярджаць, што беларуская літаратура канца XIX – пачатку XX стагоддзя, ад Ф. Багушэвіча і да пісьменнікаў-“нашаніўцаў”, была цалкам прадказальнай, вытлумачальнай. Межы чытацкай аўдыторыі, яе густы і ўяўленні аб свеце і мастацкай творчасці былі і межамі самой літаратуры. Нашы першыя паэты, празаікі і драматургі пачуваліся як рыбы ў вадзе народнай стыхіі. Не дзіва, што маладое слоўнае мастацтва адразу зрабілася папулярным, масавым. О, такія творы хацеў чуць беларускі народ – ён быў іх суаўтарам, ён пазнаваў тут самога сябе, і тое цешыла самалюбства!

З цягам часу, і гэта заўважна ў творчасці сяброў літаб’яднанняў “Маладняк” і “Узвышша”, у беларускай літаратуры паболела вынаходніцтва, “штукарства”; мастацкае мысленне пісьменнікаў усё часцей пераадольвала межы звыклай акваторыі.

Аднак беларуская invention зусім не мела намеру распачаць супрацьстаянне з convention альбо засведчыць уласную мастацкую незалежнасць, скласці маніфест. Дзясяткі літаратараў-“штукароў”, якія ладзілі разнастайныя эксперыменты ва ўласнай творчасці, працягвалі заставацца масавымі пісьменнікамі. Сыны свайго народа, бязмежна ўдзячныя бацькоўскай зямлі, яны зусім не імкнуліся тварыць на самоце іншы, адметны вобраз свету, пасярод якога б узнімалася “Вежа са слановай косткі”, апісаная Г. Флабэрам. Мастацтва дзеля мастацтва іх насамрэч не цікавіла – ніхто не збіраўся прысвячаць гэтаму жыццё.

У адрозненне ад М. Багдановіча, які “шукаў матэматычна правільнага і вернага спосабу ацэнкі твораў і прыйшоў да вываду, што такі спосаб можна знайсці, калі разлажыць твор на паасобныя абразы, звароты і словы” (В. Ластоўскі), “маладнякоўцы” і “ўзвышаўцы” пры ўсім сваім непадабенстве мелі намер і далей працаваць у рэчышчы народнай літаратуры. Тут, у звыклых вобразах і красках, было знаёмае здаровае жыццё, сапраўдная элітарнасць.

Што важна, ад чытача па-ранейшаму не патрабавалася спецыяльнай настройкі, своеасаблівай разумовай працы, гэтак неабходнай для ўспрыняцця “высокай” літаратуры. Аніякага “саду сцежак, якія разыходзяцца” збудавана не было – навошта ён, калі ёсць звыклыя сцежкі-дарожкі, агульныя для ўсіх думкі?

Ішоў час, але элітарнасці беларуская літаратура не прыдбала, толькі што індывідуалізму крыху ў ёй паболела і новых тэмаў: вайна, вёска-горад, радыяцыя etc. Invention і convention па-ранейшаму анічога не значылі ў беларускай літаратурнай прасторы 50-80-х гадоў. Мастацкія эксперыменты праводзіліся толькі зрэдчас, абрываць творы на самым цікавым месцы альбо апісваць неперарыўнасць паркаў масава ніхто не імкнуўся – і не з-за таго, што камуністы прэсінгавалі мастакоў, прымушаючы іх шыхтавацца на пляцы сацыялістычнага рэалізму, а таму што найперш самі творцы прагнулі еднасці з нацыянальнай літаратурна-мастацкай традыцыяй. У. Караткевіч, І. Пташнікаў, М. Стральцоў і інш. – усе яны былі “масавымі” пісьменнікамі і добрымі нашчадкамі школы “старых майстроў”. Іх тэксты разумелі вяскоўцы і гараджане, дворнікі і настаўнікі, шараговыя службоўцы і партыйныя бонзы, такія як П. Машэраў. Гэта была па-ранейшаму народная творчасць, ад імя народа ў звыклых формах з яснымі пасланнямі.

Калі ж СССР сканаў і Беларусь атрымала незалежнасць, то здавалася, быццам пераважная большасць беларускіх пісьменнікаў, у першую чаргу пакаленне Y, зоймецца вырашэннем чыста мастацкіх, інтэлектуальна-філасофскіх задач, будоўляй Вежы са слановай косткі па прыкладзе мастакоў з іншых краін свету. […]

Многае мусіла адбыцца ў беларускай літаратуры, якую ў далёкім 1913-м В. Ластоўскі прапаноўваў “мераць меркай еўрапейскай”, і ці хапіла б тут адных грамадскіх ініцыятыў – “Тутэйшых” дый бразгання ў тазікі? А потым, зусім хутка, здарылася непапраўнае: замест Вежы са слановай косткі паўсталі Кардыльеры[1] новых іерархій і эталонаў. […]

Прыйшоў час абвясціць бой ілжывай “высокай” літаратуры, якая, быццам 3D - праекцыя, паўстала замест не створанай у Беларусі Вежы са слановай косткі. Час прызнацца найперш самім сабе і давесці да ведама іншых, што convention – беларускі ідэйна-эстэтычны канон, тая глеба, з якой расце наш літаратурны вішнёвы сад.

Паводле П. Абрамовіча, *З якой глебы расце наш літаратурны сад?*, www.svaboda.org

[1] Кардыльеры – горная сістэма ў Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы.

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr** [ ]

| Miejsce dla egzaminatora |
|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | **Spełnienie formalnych warunków polecenia** | **1** | **0** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Kompetencje literackie i kulturowe** | 0 – 1 – 2 – 3 – 4 – 5 – 6 – 7 – 8 – 9 – 10 – 11 – 12 – 13 – 14 – 15 – 16 | liczba błędów rzeczowych | **Ogółem KLiK** |
| | | | | |

**3. Kompozycja wypowiedzi**

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3a | Struktura wypowiedzi | **3** | **2** | | **1** | | **0** | |
| | | A | B | D | C | E | F | G |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 3b | Spójność wypowiedzi | **3** | **2** | **1** | **0** |

| |
|---|
| |
| liczba błędów w spójności |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3c | Styl wypowiedzi | **1** | **0** |

**4. Język wypowiedzi**

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4a | Zakres i poprawność środków językowych | **7** | **6** | | **5** | | | **4** | | | **3** | | | **2** | | | **1** | | | **0** | | | | |
| | | 1 A | 1 B | 2 A | 1 C | 2 B | 3 A | 1 D | 2 C | 3 B | 1 E | 2 D | 3 C | 1 F | 2 E | 3 D | 1 G | 2 F | 3 E | 1 H | 2 G | 2 H | 3 F | 3 G | 3 H |

| |
|---|
| |
| liczba błędów językowych |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4b | Poprawność ortograficzna | **2** | **1** | **0** |

| |
|---|
| |
| liczba błędów ortograficznych |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4c | Poprawność interpunkcyjna | **2** | **1** | **0** |

| |
|---|
| |
| liczba błędów interpunkcyjnych |

| | |
|---|---|
| **Suma punktów** | |

## BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*